# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*2023 год*

Ліст да дзевяцікласнікаў Беларусі Inbox ×

M

Шаноўны дзевяцікласнік!
Мяне завуць Марк. Я жыву далёка ад Беларусі, але хачу пазнаёміцца з тваёй краінай. Прачытаў, што ў Беларусі шмат рэк і азёр, чыстыя лясы і гаі. А яшчэ твая краіна мае багатую і цікавую гісторыю і мову. Я пачаў спецыяльна вывучаць беларускую мову і літаратуру. Некаторыя пытанні для мяне застаюцца складанымі, таму прашу дапамогі. Упэўнены, што ты зможаш гэта зрабіць!

--
З павагай,
Марк

*Сёння мы разам з вамі зробім падарожжа ў свет беларускай мовы і літаратуры разам з Маркам, пазнаёміўшы яго з некаторымі асаблівасцямі беларускай мовы і гранямі беларускага мастацкага слова.*

## 9 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.** Першы наш прыпынак – краіна Лексікалогія. Тут шмат розных “жыхароў”, сярод іх ёсць амаформы – гэта розныя па значэнні словы, якія супадаюць у пэўнай граматычнай форме. Часта гэта словы розных часцін мовы (*вусны адказ – прыгожыя вусны*), радзей – адной (*лячу ў самалёце – лячу дзяцей*). Дапамажыце Марку размежаваць наступныя словы (словаформы), праілюстраваўшы іх магчымыя значэнні адпаведным кантэкстам. Назавіце часціну мовы, да якой яны адносяцца, і зрабіце іх графічны падзел на марфемы.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

*Разліў – разліў*; *піла – піла*; *сталі – сталі*; *палкі – палкі*.

| **Часціны мовы, да якіх належаць амаформы** | **Словазлучэнні (сказы), якія ілюструюць лексічнае значэнне амаформаў** | **Падзел слова на марфемы** |
|---|---|---|
| *разліў –* | | |
| *разліў –* | | |
| | | |
| *піла –* | | |
| *піла –* | | |
| | | |
| *сталі –* | | |
| *сталі –* | | |
| | | |
| *палкі –* | | |
| *палкі –* | | |

**Заданне 2.** У Фразеаландыі, як і ў іншых экзатычных краінах, звычайныя рэчы (словы) часта паўстаюць у вельмі нечаканых і непрадказальных праявах і незвычайна паводзяць сябе, бо вельмі цесна звязаны з жывой народнай традыцыяй, з невычэрпнай людской фантазіяй.

Паспрабуйце зарыентавацца “на мясцовасці” і вызначыце, які кампанент прапушчаны ў кожным з прыведзеных фразеалагізмаў. Выберыце гэты кампанент з прапанаваных у трэцім слупку. Насупраць абранага кампанента пастаўце ў чацвёртым слупку знак “+”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| **Фразеалагізм** | **Значэнне** | **Кампанент** | **+** |
|---|---|---|---|
| трымаць вышэй … | ‘пераставаць сумаваць, адчайвацца, паводзячы сябе горда, з пачуццём уласнай годнасці’ | плечы | |
| | | нос | |
| | | галаву | |
| | | хвост | |
| | | чало | |
| | | | |
| слацца … | ‘лісліва дагаджаць каму-н., падлізвацца да каго-н.’ | лістам | |
| | | коўдрай | |
| | | прасцінай | |
| | | абрусам | |
| | | прасціradлам | |
| | | | |
| не лезе па слова ў … | ‘ведае, што сказаць, як адказаць; знаходлівы, дасціпны ў размове’ | слоўнік | |
| | | кнігу | |
| | | галаву | |
| | | розум | |
| | | кішэню | |
| | | | |
| спусціўшы … | | рукі | |
| | | рукавы | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | ‘без належнай стараннасці, абы-як (рабіць што-н.)’ | нос | |
| | | галаву | |
| | | пояс | |
| цягнуць за … | ‘усяляк дапамагаць нязддольнаму, няўмеламу чалавеку ў вучобе, у руху па службе і пад.’ | каўнер | |
| | | рукаў | |
| | | вушы | |
| | | валасы | |
| | | руку | |
| страляць з (са) … па вераб’ях | ‘траціць шмат сіл, сродкаў на дробязі’ | ружжа | |
| | | стрэльбы | |
| | | лука | |
| | | гарматы | |
| | | кулямёта | |

**Заданне 3.** Кожны дасведчаны турыст ведае, што любая вандроўка павінна быць дакладна спланавана і падчас яе трэба строга прытрымлівацца правіл, інакш можна сутыкнуцца з небяспечнымі наступствамі. Але шмат каго прываблівае і непрадказальнасць у вандроўках, магчымасць час ад часу прымаць рашэнні, звязаныя з выбарам таго ці іншага варыянта маршруту.

Гэтаксама і з мовай. З аднаго боку, яна заснавана на дакладных правілах, якія трэба строга выконваць. А з другога – у адных і тых жа выпадках мова часам дазваляе зрабіць выбар у адпаведнасці з нашымі прыхільнасцямі, адчуваннем гармоніі маўлення.

Напрыклад, некаторыя назоўнікі ў тым ці іншым склоне і ліку могуць ужывацца не з адным, а з двума канчаткамі як варыянтнымі, якія дапускаюцца нормай літаратурнай мовы.

Адчуйце сябе падарожнікам па мове і знайдзіце такія словы ў прыведзенай табліцы. Запішыце дапушчальныя іх граматычныя формы для адпаведных склону і ліку. Насупраць астатніх слоў пастаўце прочыркі.

***Прыклад:***

| Склон і лік | Слова | Граматычныя формы |
|---|---|---|
| Родны, множны | *Секунда* | *секунд / секундаў* |
| Родны, множны | *Стол* | – |

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| **Склон і лік** | **Слова** | **Граматычныя формы** |
|---|---|---|
| Родны, множны | ступень | |
| Давальны, адзіночны | ваявода | |
| Творны | дзверы | |
| Месны | гарох | |
| Месны, адзіночны | сад | |
| Родны, множны | якасць | |

**Заданне 4.** Кожнай часціне мовы ўласцівы свой набор граматычных і лексіка-граматычных катэгорый, прычым гэтым наборам ахопліваецца абсалютная большасць слоў пэўнай часціны мовы. Усё гэта значна ўскладняе засваенне любой мовы як замежнай.

*Цікава! Склад часцін мовы ў розных мовах неаднолькавы. Адрозненні тычацца як аб'ёму асобных часцін мовы, так і ўсяго іх набору. Напрыклад, у сучаснай арабскай мове некаторыя мовазнаўцы вылучаюць усяго толькі тры часціны мовы (імя, дзеяслоў, часціцу).*

Дапамажыце Марку зарыентавацца ў Граматыцы. Марк дапусціў некаторыя памылкі як у вызначэнні часцінамоўнай прыналежнасці вылучаных слоў, так і пры іх лексіка-граматычным і ўласна граматычным апісанні. Выпраўце, дзе гэта неабходна, памылкі і патлумачце, чаму меркаванне Марка было памылковым.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Да пэўнай ступені бусел – сімвал Беларусі. Ёсць, вядома, дацкія буслы, ***апетыя***[1] Андэрсенам, ёсць буслы і ў ***іншых***[2] заходніх краінах. Ёсць яны і на поўдні. Але на ўсход ад Беларусі, ***калі***[3] не лічыць сярэднюю Азію, яны ***ўжо***[4] амаль не водзяцца.

А мне пад іх палёт асабліва добра думаецца пра Беларусь, нашу з вамі радзіму. І для вас я і ***хачу***[5], ***наколькі***[6] хопіць маіх ведаў і здольнасцяў, расказаць пра яе (*У. Караткевіч*).

| **Слова з тэксту** | **Лексіка-граматычная і граматычная характарыстыка** | **Выпраўленне памылкі (пры яе наяўнасці)** | **Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці)** |
|---|---|---|---|
| апетыя[1] | Дзеепрыметнік: залежнага стану, закончанага трывання | | |
| іншых[2] | Прыметнік: адносны, у форме меснага склону | | |
| калі[3] | Прыслоўе: часу, невытворнае | | |
| ўжо[4] | Часціца: вытворная, сэнсавая | | |
| хачу[5] | Дзеяслоў: абвеснага ладу, І спражэння | | |
| наколькі[6] | Займеннік: адносны, суадносны з лічэбнікам | | |

**Заданне 5.** Падарожнічаць могуць не толькі людзі, але і словы! Многія словы вандруюць з мовы ў мову шмат стагоддзяў, па дарозе змяняючы сваё аблічча і прыходзячы ў новы дом-слоўнік амаль непазнавальнымі.

Прачытайце слоўнікавыя артыкулы з розных слоўнікаў, назавіце тып кожнага слоўніка. Уявіце сабе, што ўсе гэтыя артыкулы змешчаны ў адным слоўніку. Якую агульную лінгвістычную задачу магла б вырашаць такая лексікаграфічная крыніца?

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| **Слоўнікавы артыкул** | **З якога слоўніка ўзяты артыкул?** |
|---|---|
| АРХІДЭЯ. Буйная шматгадовая наземная літафітная або эпіфітная травяністая расліна з духмянымі кветкамі з сямейства аднадольных. | |
| АРХІДЭЯ. Запаз. з грэч. orchidion (ядзерка). | |
| АРХІДЭЯ. корань – -архідэй-, канчатак – -а; аснова слова – архідэй-. | |
| АРХІДЭ́Я ж. архідэ́я, РДМ архідэ́і, архідэ́ю, архідэ́яй ( яю); мн. НВ архідэ́і, архідэ́й, архідэ́ям, архідэ́ямі, архідэ́ях. | |

Агульная задача:
____________________________________________

**Заданне 6.** Наступны прыпынак нашага падарожжа – Пунктуацыя. Уявіце, што існуе формула для вылічэння колькасці косак пры аднародных членах сказа:

$$x = n - 1,$$

дзе $x$ – колькасць косак, а $n$ – колькасць аднародных членаў.

Рашыце задачу:

Прапанаваны схемы сказаў з аднароднымі членамі без косак. Для якіх сказаў гэта формула правільная?

*Максімальная колькасць балаў –* ***7.***

1. […○ і ○ і ○ і ○…].
2. […○ і ○○ і ○…].
3. […і ○ і ○ і ○ і ○…].
4. […не ○○○ а ○…].
5. […○○○ і ○…].
6. […○○○○…].
7. […○ ды ○○ ды ○…].

Формула правільная для сказаў (*адзначце нумары*) ____________________

**Заданне 7.** Калі вы заўзяты турыст і прыхільнік здаровага ладу жыцця, вам будзе значна прасцей перакласці прапанаваны тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

Экологический туризм предполагает использование ресурсов естественной природной среды (памятников природы и природных достопримечательностей) для организации широкого спектра путешествий – от небольших познавательных туров для школьников до регулярных туристских программ в национальных парках и заповедниках. Он показывает важность охраны окружающей среды. Получаемая турфирмами прибыль может частично направляться на природоохранные мероприятия *(Из научной статьи).*

**Заданне 8.** Калі выдаваўся зборнік твораў беларускай паэзіі XX стагоддзя, нявопытны рэдактар вырашыў паправіць вершы, уставіўшы некаторыя словы. Гэта парушыла рытм вершаваных радкоў. Дапамажыце Марку "выратаваць" зборнік:

знайдзіце лішняе слова. У папраўленым вершы вызначце памер (колькасць стоп у вершаваным радку) і тып рыфмоўкі.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

А

Птушыныя гнёзды пад снегам заснулі,
Дрымотную пражу завеі хутка прадуць.
А хочаш – зімой закукуюць зязюлі,
Мядовыя росы на дол упадуць.

*Аляксей Пысін "Птушыныя гнёзды пад снегам заснулі"*

Б

Сцяжыны лёсу пазаплёў палын,
Бальшак Жыцця жарства наўсцяж укрыла.
І восенню пустэльнаю паныла
Шугае ў небе жураўліны белы клін.

*Мікола Мятліцкі з цыкла "Санеты Чарнобыля"*

| | **Лішняе слова** | **Памер** | **Тып рыфмоўкі** |
|---|---|---|---|
| А | | | |
| Б | | | |

**Заданне 9.** Марк знайшоў некалькі ўзораў мастацкіх прамоў з твораў беларускай літаратуры. Вызначце, хто і да каго звяртаецца ў гэтых прамовах, а таксама назавіце твор і яго аўтара.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

| | |
|---|---|
| А | Пачуй мае словы,<br>Улашчы свой камень суровы,<br>За гэта вярбою<br>Гатова я стаць над табою.<br>Твайго пешахода<br>Я ў засень ад спёкі б хавала,<br>У час непагоды<br>Ад бур і дажджоў засланяла;<br>Старымі рукамі… |
| Б | – Але мне лягчэй. Людзі заўсёды людзі. Людзі ўсюды людзі… Дай вам Бог шчасця за добрае сэрца. Шчасця з невядомай мне рускай жанчынай, такой самай добрай, як вы. <…> Маўчыце, – сказала яна амаль сурова. – Чым я магу аддзякаваць за ўсё? Толькі словам. Дай вам Бог шчасця. І вам, і дзецям, і ўсім нашчадкам вашым. Дай Бог, каб мае ўнукі ніколі не варагавалі з вашымі. |
| В | – У Вежках ты моладзь ад зямлі адбіў? Ты... Колькі гадоў сачыў за тым, каб, значыць, ніхто лішнюю бульбіну ці мех зерня ад зямлі не ўзяў... А чаму ж не браць, калі яна дае? Бегаў па гародах, каб хто лішнюю баразну не прагнаў. Хай пустуе, бур'янам зарастае... Не магі!!! З усіх сіл адбіваў ахвоту ў людзей працаваць. Крычаў да хрыпаты, што пазорна мець скаціну ў хляве, хлеба, бульбы шмат збіраць з агарода... Вось калі гол як сакол – значыць, сазнацельны! Калі ў хляве пуста – маладзец! А калі ў цябе каля хаты замест крапівы жыта калосіцца буржуй! міраед! кулак! Пуста ў хляве – пуста і ў душы будзе. І хто ты такі быў? Ні начальнік, ні падначальнік, а так... |

| | Хто звяртаецца | Да каго звяртаецца | Назва твора | Аўтар твора |
|---|---|---|---|---|
| А | | | | |
| Б | | | | |
| В | | | | |

**Заданне 10.** Сёлета Марк збіраецца наведаць Беларусь, каб пабываць у яе культурнай сталіцы гэтага года – слаўным горадзе Слуцку. А яшчэ Марк збіраецца наведаць мясціны, звязаныя з жыццём і/або творчасцю свайго любімага беларускага пісьменніка. Гэты майстар слова здольны быў стварыць верш, паэму, вершаваную аповесць, камедыю, фарс-вадэвіль, опернае лібрэта, публіцыстычны твор, зрабіць паэтычны пераклад… Янка Купала прысвяціў гэтаму пісьменніку наступныя радкі:

*І песню за песняй парадкам*
*Пусціў, як жывую крыніцу:*
*Пасыпалісь, проста як з неба,*
*“Дажынкі”, “Гапон”, “Вечарніцы”.*

Ён шмат перажыў у сваім жыцці, у тым ліку арышт дачкі Камілы за сувязь з паўстанцамі, высылка яе ў Сібір, недахоп грошаў… А сёння гэтага чалавека ведаюць далёка за межамі Беларусі: па рашэнні ЮНЕСКА 2008 год быў абвешчаны годам гэтага пісьменніка. А у гэтым годзе адзначалася 215 гадоў з дня яго нараджэння. Адным з самых вядомых яго твораў з’яўляецца фарс пра шляхту з самага поўдня Беларусі.

**Назавіце імя гэтага пісьменніка.**

**Складзіце для Марка турыстычны маршрут, які павінен уключаць тры мясціны Беларусі, звязаныя з жыццём і/або творчасцю названага пісьменніка, а таксама ўкажыце, што там трэба абавязкова паглядзець.**

**Напішыце невялікі рэкламны тэкст экскурсіі, каб вашы аднагодкі захацелі таксама праехаць гэтым маршрутам. Звярніце ўвагу, што тэкст павінен быць адрасным.**

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

*Імя пісьменніка:* ______________________________

*Экскурсійны маршрут*

| Месца | Што абавязкова трэба паглядзець |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

*Рэклама*